***

З нагоды 80-годдзя ўз'яднання БССР Нацыянальная бібліятэка Беларусі запрашае на новую выстаўку. У галерэі «Атрыум» пачаў працаваць выставачны праект «17 верасня 1939 года. Ты з Заходняй, я з Усходняй нашай Беларусі».

У кніжна-фотадакументальнай частцы экспазіцыі прадстаўлены арыгіналы дакументаў з Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусі, афіцыйныя фотаздымкі з фонду Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотадакументаў, літаратурныя водгукі беларускіх паэтаў на ўз'яднанне Беларусі, увасобленыя ў кнігах і перыядычных выданнях з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, артыкулы з газет «Советская Белоруссия» і «Звязда» за 1939 год.

У мастацкай экспазіцыі — работы айчынных мастакоў-графікаў, якія перадаюць настрой аб'яднанага народа. Шчырыя ўпэўненыя твары, працоўныя рукі, адказныя прынцыповыя характары герояў графічных сюжэтаў яскрава малююць будні БССР 1960—1980-х гадоў. Унікальная, моцная акадэмічная школа графікі савецкага рэалізму прадстаўлена фондам Нацыянальнай бібліятэкі.

Тут можна ўбачыць работы Г. Паплаўскага, Л. Рана, М. Селешчука, У. Моўчана, К. Ціхановіча, Я. Бусла, А. Паслядовіча, М. Басалыгі, Э. Агуновіча, С. Геруса, А. Кашкурэвіча, У. Шаранговіча. Графіка ў розных тэхніках (лінагравюры, афорты, лінарыт) — прыклад агітацыйнага мастацтва, вельмі папулярнага ў савецкія часы. Унікальны мастацкі пласт захоўваецца ў фондзе «алмаза ведаў», даючы магчымасць наведвальнікам бібліятэкі пазнаёміцца з досведам ранейшых пакаленняў.

У межах выставачнага праекта адбылася прэзентацыя электроннага рэсурсу «Беларуская літаратурная спадчына. Часопісы 1919—1939 гг.», дзе прадстаўлены айчынныя літаратурныя часопісы, якія друкаваліся на тэрыторыі БССР і Заходняй Беларусі з 1919 па 1939 гады. Гэта больш як 1300 нумароў з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі, Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь, Бібліятэкі Акадэміі навук Літвы і іншых інфармацыйных устаноў нашай краіны і замежжа.

***